№ 21 (603)
Субота, 6 лютага 1999 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г. на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень
Кошт: у кіёсках і крамах — 10000 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб Колас







12,3 долара — максімальны "заробак" беларускага пенсіянера за студзень (па рынкавым курсе).

Год таму максімальны памер пенсіі раўняўся 37 доларам

Рэзалюцыя Кангрэса дэмакратычных сіл Беларусі

Пра адносіны да выбараў

Кангрэс дэмакратычных сіл канстатуе, што ў Беларусі адсутнічаюць умовы для правядзення свабодных і дэмакратычных выбараў: працягваюцца палітычныя рэпрэсіі, адсутнічае доступ апазіцыі да дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі, парушаюцца правы чалавека, замацоўваюцца абмежаванні на ўдзел у выбарах, ствараюцца ўмовы для масавых фальсіфікацый вынікаў выбараў.

Закон аб выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў, прыняты 23 снежня 1998 года, не адпавядае міжнародным стандартам у галіне выбарчай працэдуры, мае шматлікія абмежаванні канстытуцыйнага права грамадзян Рэспублікі Беларусь выбіраць і быць выбраным. У прыватнасці:

* фарміраванне выбарчых камісій ажыццяўляецца выканаўчымі органамі ўлады, што стварае ўмовы для неаб'ектыўнага вырашэння праблем арганізацыі і правядзення выбараў;

* забараняецца вылучэнне кандыдатамі грамадзян, якія маюць адміністрацыйныя пакаранні, што не дазваляе браць удзел у выбарах грамадзянам, рэпрэсаваным за сваю палітычную і грамадскую дзейнасць;

* выбарчыя камісіі могуць па шматлікіх фармальных прыкметах адмовіць у рэгістрацыі або адмяніць рашэнне аб рэгістрацыі кандыдатаў у дэпутаты;

* не адпавядае міжнароднаму вопыту патрабаванне 50-працэнтнай яўкі выбаршчыкаў для прызнання выбараў адбыўшыміся, што ўрэшце не дазволіць сфармаваць прадстаўнічыя органы ўлады ў буйных гарадах;

* максімальна спрошчаны парадак датэрміновага галасавання і галасавання па месцу знаходжання выбаршчыкаў, што стварае ўмовы для шматлікіх злоўжыванняў з боку членаў выбарчых камісій і выканаўчай улады на месцах;

* не вызначаны статус грамадскіх і міжнародных назіральнікаў, што робіць немагчымым прадухіленне парушэнняў заканадаўства і фальсіфікацыяў вынікаў галасавання;

* дазваляецца удзел у выбарах грамадзянам іншых краін, што супярэчыць Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Удзел дэмакратычных сіл у выбарах у мясцовыя Саветы на падставе такіх "законаў" не з'яўляецца магчымым.

Удзельнікі Кангрэса дэмакратычных сіл заяўляюць, што ўдзел у выбарах стане магчымым пры выкананні наступных умоў:

* прыняцце за аснову выбарчых законаў, легітымнасць якіх не выклікае сумневаў;

* неспалучэнне выбараў з рэферэндумамі;

* спыненне пераследу грамадзян па палітычных матывах і вызваленне ўсіх палітвязняў;

* забеспячэнне прадстаўнікам усіх рухаў, палітычных партыяў і грамадскіх арганізацыяў свабоднага доступу да дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі, у першую чаргу — да тэлебачання і радыё;

* фарміраванне Цэнтральнай і тэрытарыяльных камісій па выбарах дэмакратычным шляхам;

* скасаванне неабгрунтаваных абмежаванняў на вылучэнне кандыдатаў і на правядзенне перадвыбарчай агітацыі і прапаганды;

* стварэнне ўмоваў, якія забяспечваюць давер да вынікаў галасавання, у тым ліку магчымасць грамадскага назірання за ўсім выбарчым працэсам.

Открытое письмо

Исполнилось два года, как лишен свободы депутат Верховного Совета Республики Беларусь 13-го созыва Владимир Кудинов. Год, как содержится под стражей его коллега по парламенту Андрей Климов.

Можно, конечно, говорить об официальных обвинениях, но все знают: провинились эти законодатели перед режимом в том, что в 1996 году поставили свои подписи под обращением в Конституционный суд об отрешении Александра Лукашенко от должности президента.

Редакция газеты "Народная воля" получила на днях письмо жены Владимира Кудинова, с содержанием которого мы решили ознакомить читателей.

...И пятый год ломаются судьбы многих людей

Неумолимо бежит время, идут годы. Пятый год у нас в республике существует президентская власть. И управляет государством один человек — Лукашенко. И пятый год — месяц за месяцем, день за днем — Республика Беларусь все ниже катится в экономическую и политическую пропасть. И пятый год ломаются судьбы многих тысяч белорусов.

Судьбы Кудинова и Климова — депутатов Верховного Совета 13-го созыва, судьбы Старовойтова и Леонова, судьбы молодых ребят Шидловского и Лобковича и многих, многих других. Судьбы их жен и детей, матерей и отцов, родных. Кто за это понесет ответственность?

Я обращаюсь к вам, депутаты карманного президентского парламента. Вы сидели рядом с Кудиновым и Климовым, вы здоровались с ними за руку, решали вопросы, пили кофе (и не только) за одним столом. Почему вы взираете на все происходящее со страхом в глазах, подобострастно киваете головой, слушая очередную демагогию, которая летит из уст "всенародно избранного" и боитесь его взгляда, его гнева?

В душе каждый из вас знает, что перемены у нас будут, и каждый день приближает это время. Многие из вас, наверное, уже подготовили себе новую маску. Но и сквозь новые маски люди будут узнавать вас, растоптавших принципы человечности, и вряд ли доверятся вам вновь.

Годы... Два года Владимир Кудинов, один год Андрей Климов — в лукашенковских застенках. Вы, ребята, так похожи. Оба — крупные предприниматели, принципиальные, умные, добрые, верили в людей, в их доброту, не умели приспосабливаться и лгать, но умели работать по большому счету. Силы вам, выдержки и здоровья! Мы все должны сохранить свое человеческое достоинство и силы, чтобы наши дети и внуки с гордостью произносили свои фамилии.

А история еще скажет свое слово. Надеюсь, очень скоро.

Зоя КУДИНОВА, жена депутата Верховного Совета 13-го созыва Владимира Кудинова, осужденного нынешним режимом.

Постфактум

Депутаты Верховного Совета 13-го созыва, не ставшие на колени перед одним человеком и оставшиеся на свободе, в феврале 1999 года вновь, видимо, сильно "провинились" перед режимом — назначили выборы президента. В связи с этим не исключено, что список арестованных депутатов Верховного Совета 13-го созыва может существенно пополниться. Хотя история показывает, что такой шаг еще ни одну власть не спасал.

Факт

Белорусско-российский Союз постоянно подвергается суровым испытаниям на прочность. Серьезные экономические претензии белорусской стороне только в январе текущего года уже высказали российские транспортники и газовики, демонстрируя полное неудовольствие существующими финансовыми соглашениями и поведением белорусских партнеров. Официальный Минск делает вид, что все в порядке.

Комментарий

Михаил ПОДОЛЯК

Беларусь просит милостыню

Россия против интеграции за ее счет

Интеграция — штука, конечно, замечательная. Так, Беларусь в обмен на свой государственный суверенитет, скорее всего, получит статус "российского дотационного региона". Вместе с чем вполне законно сможет претендовать на некий мизерный процент российского бюджета, бесплатное нефтегазовое сырье, унифицированное платежное средство, свою долю западных кредитов. Россия получит, ни много ни мало, весьма своеобразное политическое пространство (чего только стоят амбиции и поведение нашего президента!): умирающие производства, голодных людей, очаг национального недовольства, и конечно же расширение на Запад контролируемых транзитных территорий.

Тем не менее, несмотря на столь радужные перспективы недалекого будущего, сегодня многие российские рыночные субъекты в отношениях со своими белорусскими партнерами руководствуются исключительно экономическими интересами. А потому, пока официальный Минск и политический бомонд Москвы сколь угодно долго и красиво рассуждают о славянской интеграционной архитектуре, реальная интеграция измеряется упущенными выгодами, убыточностью совместных предприятий и абсолютной неспособностью рассчитываться по взаимным долгам.

В январе официальные российско-белорусские чиновники демонстрировали широкой общественности немедленную готовность приступить к политическому единению двух государств. На внеочередной сессии так называемого Парламентского собрания Союза Беларуси и России депутаты инициировали создание комиссии по унификации законодательств суверенов, а также установили примерные сроки этапной интеграции. Как известно, в том же январе славянское единство подверглось жестким экономическим испытаниям. Вначале разыгрался белорусско-российский транспортный конфликт, приведший к массовому скоплению белорусских автоперевозчиков на российской границе. Затем руководство "Газпрома" объявило о своем намерении сокращать объемы поставляемого в Беларусь газа, а также категорически отказалось отпускать его белорусской стороне по внутренним российским ценам, на чем, как известно, настаивал белорусский президент А. Лукашенко, незримо присутствовавший на всех белорусско-российских консультациях Сергея Линга. Резонно задаться вопросом: следует ли чистую политическую спекуляцию громогласно именовать межгосударственной интеграцией?

Минтранс России одним из первых подсчитал, что мнимая "транспортная" интеграция лишает российский бюджет как минимум 300 млн. долларов. Именно во столько обходится России транспортно-таможенная неопределенность на белорусско-российской границе. Более того, белорусские транспортные компании постепенно захватывают лидирующие позиции на российском рынке автоперевозок, обслуживая порядка 40—50 процентов всех транспортных сделок. Происходит это за счет более низкой себестоимости белорусских транспортных услуг — в Беларуси у транспортников гораздо ниже налоговые отчисления, а расходы на содержание шоферов, техников и автопарка вообще мизерные. Понятно также, что белорусские автокомпании не могут быть задействованы в транспортном обслуживании белорусских потребительских рынков и прежде всего в силу резкого падения внешнеторговых оборотов, особенно чувствительного в последние полгода. По большому счету, Беларусь сегодня практически не имеет полноценных торговых контрактов не только с Западом, но также с нашими ближайшими соседями — Польшей, Прибалтикой, Украиной. По крайней мере, эти торговые контракты столь ничтожны, что не в состоянии обеспечить работой белорусских транспортников. Вот и ринулись наши "дальнобойщики" подрывать транспортный рынок соседней России. Российский водительский профсоюз совместно с Минтрансом потребовал от белорусской стороны более корректного отношения к своему транспортному рынку, выполнения соглашений по паритетному участию компаний в этом рынке, а также визирования в Москве специальных разрешений на обслуживание российско-зарубежных торговых контрактов. В ответ же российские транспортники получили... мощнейшее политическое давление со стороны спикера российской Думы Геннадия Селезнева, обвинившего транспортников в покушении на славянское братство, и промышленного лобби, которому весьма выгоден дотационный регион, расположенный в западном направлении.

Еще запутанней ситуация с "Газпромом". То, что сегодня белорусский долг за газ составляет без малого 350 млн. долларов, волнует практически только руководство "Газпрома" и лично Рэма Вяхирева. Все прочие стороны, так или иначе заинтересованные в белорусско-российских газовых взаимоотношениях, прекрасно понимают, что газовые долги — это исключительно политическая конъюнктура. По крайней мере, до той поры, пока Беларусью управляет Александр Лукашенко. Тем не менее белорусская сторона активно торгуется с "Газпромом", пытаясь утрясти нормы газового потребления на 1999 год, а заодно и новые отпускные цены на газ. Известно, что в начале января Александр Григорьевич обрадовал жителей Беларуси заявлением о том, что российская сторона будет отпускать нам газ по своим внутренним ценам — что-то около 35—37 долларов за 1000 кубометров. Все это преподносилось в качестве "очевидных преимуществ славянской интеграции". По существу же оказалось, что уже в начале февраля "Газпром" снизил ежедневный отпуск газа для Беларуси примерно на 5 млн. кубометров, и теперь дневная норма потребления республики составляет 48—50 млн. кубометров вместо 52—55 миллионов. "Газпром" настаивает на том, что политика — политикой, но для России сейчас более важно, чтобы ее бюджет наполнялся реальными деньгами, а на рынок поступали дешевые товары. Не важно — произведены они в соседней славянской державе или где-то еще.

Собственно, нынешние экономические неурядицы двух государств — это, как можно предположить, начало затяжного и весьма болезненного конфликта, который только будет усугубляться по мере приближения объединительного часа "Х".

Горячая пора "Маладога фронту"

Она начинается 14 февраля. В это день, как планируется, в Минске в 17 часов должен начаться марш "Беларусь — в Европу!", участники которого, стартовав с площади Свободы, разнесут по посольствам, аккредитованным в Беларуси, петицию. Первых два подобных марша прошли в Минске в феврале и марте 1997 года. Они имели достаточный международный резонанс, поэтому принято решение о проведении такой же акции и в этом году. Две заявки на проведение марша уже поданы в Мингорисполком.

25 февраля на свободу выходит Алексей Шидловский. Этот активист "Маладога фронту" был приговорен к полутора годам заключения за нанесение антипрезидентских граффити в городе Столбцы в августе 1997 года. Шидловский отбыл этот срок, и теперь его товарищи планируют встретить политзаключенного массовой акцией, заявка на которую также вскоре будет подана в Мингорисполком.

Пресс-центр Хартии'97.

У брэсцкіх школах абвешчаны каранцін па грыпе

З 4 лютага ў школьнікаў Брэста пачаліся незапланаваныя канікулы — рашэннем галоўнага санітарнага ўрача Вячаслава Ракаця ў горадзе абвешчаны каранцін па грыпе.

Як паведаміла загадчык эпідэміялагічнага аддзела Брэсцкага абласнога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Ала Корзан, парогавы ўзровень захворваемасці перавышаны амаль у 8 разоў. Паводле сведчання медыкаў, штодзённа ў паліклінікі горада звяртаюцца з грыпам каля 1 тысячы гараджан, большая частка з якіх — дзеці. Як мяркуецца, вірус прыйшоў у Брэст з Польшчы: менавіта ў прыгранічных вёсках былі першапачаткова зафіксаваныя ўспышкі гэтай хваробы. Так, у Камянецкім раёне сёння зачынены на каранцін 15 школ; хутка чакаецца ўспышка хваробы ў Баранавічах і Пінску.

Сёлета хвароба, як правіла, праходзіць цяжка — з высокай тэмпературай і галаўнымі болямі. Смяртэльных выпадкаў ад грыпу на сённяшні дзень у вобласці не зафіксавана.

Валянціна КАЗЛОВІЧ.

Да сусветнага ўзроўню

Канцэрнам "Белнафтахім" і міждзяржаўнай кампаніяй "Фармаш", галаўны офіс якой знаходзіцца ў Маскве, пры ўдзеле міністэрстваў эканомікі і фінансаў Беларусі і Расіі распрацавана сумесная праграма — "Арганізацыя серыйнай вытворчасці абсталявання для выпуску хімічных валокнаў і ніцей". Па папярэдніх разліках, эканамічны эфект ад яе рэалізацыі складзе каля трох мільярдаў расійскіх рублёў. Створанае абсталяванне будзе адпавядаць сусветнаму ўзроўню, а затраты на яго акупнасць у параўнанні з імпартным змяншаюцца ў паўтара—два разы. Шэраг навуковых распрацовак па праграме дае падставы сцвярджаць, што шкодныя хімічныя выкіды ў атмасферу зменшацца ў 17 разоў, а ў далейшым знізяцца да нуля.

Лілія КРАПІВІНА.

Надвор'е

6 і 7 лютага на тэрыторыі рэспублікі захаваецца воблачнае надвор'е, часам — снег, мяцеліца. Вецер паўднёва-заходні і заходні, парывы — 15—20, 6-га месцамі да 24 м/с. Тэмпература паветра 6-га на працягу сутак — -2...-7, па паўднёвым усходзе -4...+1; 7-га ўначы — -5...-10, удзень — -3...-8.

Пр. Ксеніі, Герасіма, Агаты, Анастаса, Васілы, Цімафея.
К. Дароты, Багдана, Паўла.

85 гадоў з дня нараджэння А. А. Куляшова (1914—1978), народнага паэта Беларусі.

ЛЮТЫ 6
'99 СУБОТА

Усход 7.48
Захад 17.01
Даўж. дня 9.13

Апошн. квадра 8 лютага
Захад 11.03
Усход —

Пр. Віталя, Майсея, Піліпа, Рыгора, Селівана.
К. Рамуальда, Рышарда, Тодара.

ЛЮТЫ 7
'99 НЯДЗЕЛЯ

Усход 7.46
Захад 17.03
Даўж. дня 9.17

Апошн. квадра 8 лютага
Усход 0.49
Захад 11.24

Пр. Ананія, Аркадзя, Івана, Іосіфа, Пятра, Сямёна, Фёдара.
К. Геронімa, Пятра, Яна.

85 гадоў з дня нараджэння В. П. Таўлая (1914—1947), беларускага паэта, дзеяча рэвалюцыйна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі.

ЛЮТЫ 8
'99 ПАНЯДЗЕЛАК

Усход 7.44
Захад 17.05
Даўж. дня 9.21

Апошн. квадра 13.58
Усход 1.54
Захад 11.45

Владимир ВОЛАНИН

РАБСТВО

Местная исполнительная "вертикаль" пытается возродить "крепостное право"

До 1861 года в России существовал институт крепостных крестьян. По большому счету это были своеобразные "аграрные рабы", приписанные к конкретному сельскохозяйственному угодью. Крестьяне имели только одно право — работать с утра до ночи. Все остальное: потребление пищи, женитьба, обустройство собственного жилища и особенно возможность самостоятельно выбирать себе новое место работы — оставалось в ведении хозяина.

Чуть более ста лет понадобилось суверенному государству Беларусь, чтобы вернуться к архаичной практике "крепостного права". Причем вернуться не в некой абстрактной категории, а в самой настоящей форме. Так, 11 января сего года двумя провинциальными начальниками — ***председателем Полоцкого районного исполнительного комитета Иваном Коростиком и председателем Новополоцкого городского исполнительного комитета Александром Комаровым*** — было сочинено и подписано по всем бюрократическим правилам революционное **Соглашение**, согласно которому сельскохозяйственные рабочие Полоцкого района с 1 января 1999 года в буквальном смысле превратились в "крепостных". Цитируем: ***"Полоцкий районный исполнительный комитет ходатайствует перед Новополоцким городским исполнительным комитетом о запрещении руководителям предприятий, организаций и учреждений города Новополоцка с 1 января 1999 года принимать на работу работников колхозов, совхозов и обслуживающих организаций... а именно: специалистов сельского хозяйства, трактористов, токарей, водителей автомобилей, слесарей, сварщиков, работников животноводства"***.

Как видно, искать работу в крепких городских хозяйствах запрещено как раз представителям более-менее престижных профессий. Известно, что именно эти профессии на рынке труда весьма котируются, а значит, их обладателям вполне по силам претендовать на сносные зарплаты. Действительно, зачем человеку, у которого на плечах многодетная семья, торчать за бесценок в нищем колхозе?

Впрочем, сердобольные исполкомовские начальники с пониманием отнеслись к инициативе своих районных коллег, а потому ответили на просьбу в истинно советском духе. Читаем дальше в соглашении: ***"Новополоцкий городской исполнительный комитет ОБЯЗУЕТСЯ ЗАПРЕТИТЬ руководителям предприятий, организаций и учреждений города Новополоцка принимать на работу с 1 января 1999 года без согласования с Полоцким райисполкомом и райсельхозпродом работников указанных в пункте 1 настоящего соглашения специальностей и категорий"***.

Дескать, всех "колхозных диссидентов", желающих работать на благо родины в городе, обязуемся просто не пущать в Новополоцк. Пусть лучше перебиваются с хлеба на воду, естественно, вместе с районным начальством, в своих родных пенатах.

Как назвать подобное поведение официальных представителей президентской власти? Понятно, что колхозы и совхозы находятся сегодня в весьма плачевном состоянии: многое пришло в упадок, многое разворовано. Радикальная реформа колхозно-совхозной системы уже давно назрела — земля требует по меньшей мере собственника, способного ответственно подходить к сельхозпроизводству. Но, как известно, нынешние власти настаивают на том, что только колхозы в состоянии обеспечить государство необходимым количеством продуктов. На саом деле, колхозы погибают, люди разбегаются, не в силах выдержать голод, нищету, произвол местечковых начальников и абсолютную беспросветность.

Понимая, что удержать людей в колхозах они не смогут, власти прибегают к прямому насилию. По сути, данное **Соглашение** не просто очередное нарушение прав человека. К этому в Беларуси уже начинают привыкать. Скорее всего белорусская исполнительная власть всерьез надеется вернуть республику во времена рабства и "хозяйского" произвола. Ведь рабы, по крайней мере, молчаливы и не требуют хорошей и обильной пищи.

Спорт

Биатлон

Белорусы могут перейти дорогу российским коллегам

Такого мнения придерживается главный тренер сборной России Виталий Фатьянов, говоря о перспективах выступления своих подопечных на открывающемся сегодня в Финляндии чемпионате мира по биатлону. По его прикидкам, белорусские стреляющие лыжники почти во всех дисциплинах могут претендовать на призовые места. В частности, он отдает предпочтение нашим мужчинам в индивидуальных гонках, а вот эстафетные оставляет за собой, делая при этом акцент на то, что на последнем перед мировым первенством этапе Кубка мира в Италии не было равных российскому женскому квартету.

По мнению российского специалиста, хорошие шансы на завоевание наград имеют Алексей Айдаров и Олег Рыженков. Первый из них, по его наблюдениям, способен преподнести неожиданный сюрприз на любой индивидуальной дистанции. Отличившись в Нагано на "классической двадцатке", он затем удивил всех, когда на кубковых соревнованиях при участии сильнейших мастеров спринта победил на этой дистанции. Большими возможностями располагает и Рыженков, что он не раз и доказывал на мировых чемпионатах, хотя, как считает российский тренер, ему не хватает стабильности в стрельбе. Правда, менее оптимистично Виталий Фатьянов оценивает возможности белорусской женской команды.

В свою очередь главный тренер белорусской сборной Владимир Плаксин не склонен переоценивать возможности наших стреляющих лыжников. "Мы, конечно, рассчитываем на основных "бойцов" команды, в том числе и на Вадима Сашурина, — сказал он корреспонденту БелТА перед отъездом в Финляндию, — однако на соревнованиях такого уровня случается всякое. Пример тому — Нагано, когда наш Попов, прекрасно "отработав" спринт, дожидался медали, но из-за испортившейся погоды гонка была отменена. Есть и другие причины, вызывающие беспокойство. Теперь, как известно, в программе чемпионата нет командной гонки, где мы по традиции занимали высокие места. Она заменена на так называемый массовый старт. К сожалению, не нашли достойной замены Попову в эстафетной команде."

Однако, заявил Плаксин, белорусские спортсмены способны и будут бороться за медали и на этом мировом смотре сильнейших мастеров биатлона.

Вячеслав ДУТОВ, БелТА.

Футбол

Суперклубы подбивают "бабки"

Самым "богатеньким Буратино" 1998 года стал английский "Манчестер Юнайтед", заработавший за минувший год 89 миллионов фунтов стерлингов. Доходы других футбольных суперклубов Европы выглядят следующим образом: "Барселона" (Испания) — 58 млн фунтов, "Реал" (Мадрид) — 55 млн фунтов, "Ювентус" (Италия) — 53 млн фунтов, "Бавария" (Германия) — 51 млн фунтов.

Волейбол

"Амкодор" воспрянул...

Волейболистки минского "Амкодора" снова смогли порадовать своих поклонников. Ведь после того как в стартовом туре Лиги чемпионов белоруски победили хорватский "Дубровник", последовали два поражения подряд — от испанского "Тенерифе" и австрийской "Фуджицу Пост". В четвертом туре подопечные Геннадия Александровича принимали дома швейцарскую "Конкордию" и довольно легко одержали победу. Счет встречи — 3:0 (25:17, 25:21, 25:18).

Приводим также результаты других встреч группы "А": "Тенерифе" — "Фуджицу Пост" — 3:1, "Амичи" (Румыния) — "Канн" (Франция) — 0:3..

После четырех туров турнирная таблица выглядит следующим образом: "Тенерифе", "Канн" — по 8 очков, "Фуджицу Пост" — 7, "Амкодор" — 6, "Конкордия" — 5, "Августа" (Польша) — 4 (после 3 игр), "Амичи" — 4, "Дубровник" — 3 (3).

В следующем туре "Амкодор" встретится в гостях с "Канном".

В продолжение волейбольной темы отметим, что на днях состоялась отчетно-выборная конференция Белорусской федерации волейбола. В результате вместо руководившего БФВ с 1991 года Анатолия Пушко президентом был избран министр жилищно-коммунального хозяйства Борис Батура. Продолжилась тенденция, согласно которой высшие государственные чины занимают руководящие посты в общественных спортивных организациях. Впрочем, может быть, хотя бы это поможет белорусскому волейболу выйти из того кризисного состояния, в котором он нынче пребывает.

Дмитрий ЕРМАК.

Васіль ГРОДНІКАЎ

Вірус настальгіі, або Роздум над труной нябожчыка

2. Халява — клёвая спакуса

Расказвалі мне, што некалі ў нашай вёсцы адбыўся на той час неверагодны выпадак: пасля таго як сыны пажаніліся, бацька выдзеліў ім па кавалку зямлі, даў на развод жыўнасці, сунуў кожнаму ў кішэню па некалькі злотых і сказаў: "Жывіце самастойна і не ганьбіце наш род". Прайшло колькі часу, і адзін з сыноў, у якога не ладзіліся справы з гаспадаркай, прыйшоў да бацькі прасіцца назад. Той разгневаўся, зняў папругу, адлупцаваў сына як след і пагнаў перад сабой сярод белага дня праз усю вёску на ягонае новае селішча, прыгаворваючы: "Ты абняславіў наш род!.. Не ладзяцца справы, кажаш? А ты працуй больш: позна кладзіся і рана ўставай. Дабрабыт трэба потам здабываць!". Да таго часу і з тае пары ў нашым краі ніхто з адлучэнцаў да бацькоў не вяртаўся. Як ім жылося, пра тое вам цяпер ніхто не скажа, але дамысліць можна: той, хто стараўся і спадзяваўся на сябе, той жыў спраўна, а хто не — ішоў у парабкі.

Гэтая прытча нагадалася мне пасля таго, як нядаўна ля аўталаўкі (а гэта адзінае ў нас месца, дзе сёння збіраюцца людзі) пачуў такі дыялог старой кабеціны з шафёрам-лавачнікам:

— Вось бы хутчэй нам аб'яднацца з Расіяй.

— А якая табе карысць ад гэтага аб'яднання?

— Ну як жа? Там і нафта ёсць, і газ, і рознае паліва, чаго ў нас няма.

— Дык тое ж у Расіі, а не ў нас.

— І нам бы перапала...

— Цяпер, цётка, не той час, каб на халяву. За ўсё трэба плаціць. А ў нас грошай з гулькін нос. А таму трэба думаць не пра аб'яднанне, каб за чужы кошт пажывіцца, а самім старацца. Трэба самім больш працаваць.

— Ды куды ўжо больш, — уздыхнула старая і сціхла. Прымоўклі і астатнія, пэўне, задумаліся: няўжо прыйшоў час жыць за сваё?

Такія вось меркаванні можна пачуць пераважна ў вёсцы і сярод пэўнай часткі гараджан, так званага радавога электарату. Тут і там з адпаведных часоў хутка прызвычаіліся да таго, што калі што-якое, то ім дапамогуць, не дадуць памерці з голаду, выдзеляць так званую бясплатную кватэру або хату, зробяць бясплатны рамонт, пашлюць у дом адпачынку або санаторый, нарэшце, выдзеляць нейкую суму грошай у якасці беззваротнай дапамогі. Адным — больш, другім — менш, трэцім за ўсё жыццё — ні капейкі, ні драбніцы. І шмат хто зразумеў, што не варта старацца, выцягвацца ў жылу, можна схавацца за саслужыўца, бо за вынікі працы адказвае калектыў, а гэта значыць — ніхто персанальна. Пражыць на халяву была і ёсць вельмі ўжо клёвая спакуса для шмат каго з нашых суграмадзян.

А вы паглядзіце, што робіцца сёння ў электрычках, гарадскім грамадскім транспарце, каля вакзалаў і на рынках. Там жа, можа, адзін ці два з сотні, хто просіць міластыню, сапраўды знаходзіцца на самым краі беднасці і каму варта падаць. Астатнія — на халяву, як і раней. Але цяпер ужо ў больш адмысловай форме. Але даруй, Госпадзі! Як іх адрозніш — яны ўсе такія майстры выціснуць слязу, спагаду? І паверх спагады на заклік "хто колькі можа!" я — пенсіянер — кладу ў шапку такога ж пенсіянера "пяцёрку", бо стаіць ён у мяне над душой з працягнутай рукой і зусім не задумваецца над тым, што, можа, у мяне пенсія яшчэ меншая, чым у яго. "Няхай дае вам Бог здароўечка", — зычыць ён мне за кошт Бога і за маю "пяцёрку" — паратунак ад розных маіх хвароб. А я між тым думаю зусім пра іншае: гэты, можа, і не такі бедны, як я, а выманіў кавалак ліверкі, які ў мяне самога з роту не валіцца.

Жабрак у жабрака торбу адбірае...

Беларусь, як вядома, пасля Вялікага княства Літоўскага жыла не адна. То з Польшчай, то з Расіяй. А дакладней — "пад". І там, і там яна была то ўсходнімі крэсамі, то паўночна-заходнім краем. Адным словам, перыферыяй. Каб гэтая з'ява стала пагалоўным генетычным памкненнем беларусаў, то не скажаш. А калі сказаць, што Беларусь няздольная на самастойнае існаванне, таксама акажацца далёкай ад праўды. Як жа так адбылося, што мы з сардэчна-настальгічным болем успрымаем нашу разлуку з таталітарнай, дыктатарскай, прыгоннай і рэпрэсіўнай сістэмай, інакш — з былой нашай вялікай Радзімай — Савецкім Саюзам? Адны незадаволены тым, што там, у Расіі, у іншых былых савецкіх рэспубліках засталіся родныя, знаёмыя, сябры. Другія — што цяжка дабірацца да іх, бо трэба афармляць візы, мяняць дарагія ім беларускія "зайчыкі" на нейкую там валюту, дорага плаціць за білеты, выкладваць грошы за афармленне яшчэ нейкіх там дакументаў. Але гэта не дужа вялікая колькасць незадаволеных і ціхіх прыхільнікаў аднаўлення Саюза. Найбольшая ж частка і вельмі ўплывовая на дзяржаўным узроўні — кіраўнікі розных прамысловых, сельскагаспадарчых і іншых прадпрыемстваў, арганізацый і падраздзяленняў, якія навучыліся за апошні час спісваць свае няўдачы ў эканоміцы або бяздарнае кіраўніцтва за кошт парушаных гаспадарчых сувязяў у выніку распаду СССР. Так і чуецца з усіх бакоў: не даюць нафты, газу, бензіну, апусцілі шлагбаўмы да танных металаў, адключылі рубільнікі падачы электраэнергіі і перакрылі шляхі паступлення іншай халявы. Маўляў, за ўсё зараз трэба плаціць і даволі часта — па сусветных цэнах, бо дармаўшчына скончылася, а замест яе ўступіў у сілу нязвыклы для нас, "саўкоў", эканамічны закон: тавар—грошы—тавар. А вось грошай у нас якраз і няма. А жыць хочацца, халявы па-ранейшаму хочацца, ад дармаўшчынкі не адвыклі. Ну як тут быць, як тут пагаспадарнічаеш, калі ў кішэні — адзін шыш з ветрам напалову?

Нейкая частка "абяздоленых" не можа змірыцца з тым, што жыць мы сталі ў адносна маленькай краіне, якая не можа пастаяць за сябе так, як колісь стаяў СССР. Не можа прадыктаваць сваю волю Захаду і іншым дзяржавам, стукнуўшы кулаком па стале, пагрозамі і ядзерным шантажом прымусіць іншыя дзяржавы паважаць нас гэтак, як хочацца менавіта нам. Адным словам, Беларусь, разлучаная з СССР, цяпер згубіла адбітак любімага твару "держиморды" і сусветнага жандарма, які гэтак вабіў і яшчэ сёння вабіць многіх па-савецку ваяўнічых прасталюдзінаў і наменклатуру ўсіх узроўняў знізу да верху.

Дык адкуль жа такая ўстойлівая настальгія па былым Савецкім Саюзе? На гэтае пытанне спрабавалі і спрабуюць сёння адказаць і вучоныя, і палітолагі, і палітыкі. Адказы іх розныя, у залежнасці ад іх палітычнай або партыйнай арыентацыі і прыналежнасці.

Тут, у вёсцы, мне даводзіцца вельмі часта размаўляць з мужыкамі і нават маладзіцамі на гэтую тэму. Ну млеюць некаторыя з іх ад таго, што жывуць яны цяпер не ў Савецкім Саюзе, а ў Беларусі. Пытаюся: "Ну а што, ад гэтага твая карова стала менш малака даваць, бульба ці агуркі перасталі радзіць, лета стала засушлівае ці хату па самыя вокны вясной залівае?". — "Не, — кажа, але ўсё ж". — "Што, пытаюся, "усё ж"?". Аргумент такі, што, маўляў Беларусь бедная, няма карысных выкапняў, нафты, газу, вугалю, электраэнергіі. А тады, пры СССР, усяго гэтага можна было браць колькі хочаш. На халяву, значыцца. Тлумачу, что Беларусь у адрозненне ад некаторых развітых краін мае значна больш прыродных прыпасаў, чым, скажам, Фінляндыя, Японія, Данія... Адказ — смехатворны: затое там рыбы навалам. Зніжаю ўзровень палемікі да ўзроўню свайго субяседніка. А ў нас калійных угнаенняў навалам, лесу — таксама, залежы нафты (а не здабычы) таксама някепскія, шмат матэрыялаў для вытворчасці будаўнічых канструкцый, цэглы, посуду. Ды знайшлі яшчэ вугаль, золата, алмазы... Адказ: яно так, але дастаць гэта з-пад зямлі яшчэ трэба. І тут у мяне пад бокам якраз аргумент даўні аказаўся, але дагэтуль не было зручнага выпадку, каб выкарыстаць яго належным чынам. Адзін мой аднавясковец яшчэ да майго прыезду сюды (гэта было, мусіць, гадоў пятнаццаць таму) рашыў прыляпіць да хаты трысцен. Таму што жыць у маленькай хаце сям'і з пяці чалавек было даволі цесна. Гаспадар купіў цэглы, цэменту, шыферу, навазіў бярвенняў, нарэзаў дошак. Адным словам, залівай фундамент і выводзь трысцен хоць восем на сем. Але... Прайшло з тае пары паўтара дзесятка гадоў. Зляжаўся цэмент. Цэгла, складзеная штабялямі пад хатай, разы тры падала і кожны раз рабіла бой. Шыфер аброс мохам, бярвенні і дошкі даўно з'еў шашаль. Ці гаворыць табе што, кажу субяседніку, гэты факт? А ён зноў сваё: ну няхай сабе. А вось пра тое, што гаспадарчыя сувязі парваліся, што заводы і фабрыкі калдыбаюць, калгасы на ладан дыхаюць, як гэта ты мне растлумачыш? Кажу яму проста: наладжваць новыя сувязі, аднаўляць старыя, прадаваць або перадаваць у прыватныя рукі тое, што дзяржава і яго дырэктарскі чырвоны корпус не ў стане падняць, выпускаць лепшую прадукцыю, за якую б плацілі добрыя грошы... Ён: "Лёгка сказаць!". — Я: "А вось ты паглядзі — гадоў сем ці восем стагналі, спісвалі сваю бездапаможнасць на развал СССР, а толькі цяпер прыйшлі да высновы, што хоць і цяжка, але аднаўляць сувязі трэба. І паспяхова, бывае, аднаўляюць. Вунь паглядзі, як носяцца кіраўнікі розных галін гаспадаркі разам з прэзідэнтам па ўсёй Расіі. Значыць, можна? Ты вось толькі ўдумайся: амаль дзесяць год гвалтам крычалі, слёзы вёдрамі лілі, толкам нічога не рабілі. Лічы, праціўнікі самастойнага развіцця Беларусі ладзілі, што называецца, самы сапраўдны сабатаж. А цяпер глянь: у тых жа прыватных руках прадпрыемствы, нават сельскагаспадарчыя, працавалі і працуюць значна лепш. У іх і сувязі ёсць, і прадукцыя па якасці і мадэрне куды лепшая. А ўяві: калі б дзяржава хоць трошкі ім дапамагла б, то зусім іншая справа была б, а? Яно так: круці — не круці, а рогам супраць жыцця не папрэш. І ты думаеш, што пры такіх тугадумах ды "стараверах", якія спяць і мараць, каб свабодны рынак запрацаваў у святыя ніколі, мы добра зажывём?". Зноў адказвае: ну няхай сабе. А вось раней нас баяліся, а цяпер — не. Ну што ты яму на гэта скажаш?..

Нашы людзі, думаю, выхаваны дзесяцігоддзямі ці нават стагоддзямі так, што перавагу аддавалі сіле мускулаў, а не сіле розуму. І самі вучыліся гэтаму і іншых навучылі не паважаць адно аднаго, а баяцца. Адкуль прыйшла такая трасца: ад людскога асяродку да ўлады ці ад улады ў людскі побыт? Ледзь што не так — кол з плятня, за сякеру, за танкі і аўтаматы, санкцыі, эмбарга і глядзіш — палілася ракою людская кроў. А што рабіць, калі гэта — самы просты і танны спосаб разборак на самым высокім узроўні. І мэты дасягнеш, калі выйграеш, і праблем менш будзе (няма чалавека — няма праблемы!). І цяпер, у "сенцах" дваццаць першага стагоддзя, за жаданне свабоды і незалежнасці — сама меней — за краты, а то могуць, як у Чэчні, пад "нуля" зруйнаваць усё жывое і нерухомае, апасля яшчэ для поўнай упэўненасці зрабіць "зачыстку", як любяць часам выхваляцца нашы ваенныя начальнікі. І ў побыце нешта такое таксама робіцца. Напрыклад, калі старшыні калгаса не падабаецца хто-небудзь з сельскіх жыхароў — пляц (соткі) па вуглы абрэжа. Сена, саломы, каня не дасць. Не спадабаліся суседзі — адсяліць з вачэй далей, а то і з вёскі, калгаса. А хто мацнейшы, то і з раёна, краіны. Нават замежных падданых. Усё залежыць ад сілы мускулаў, ваяўнічасці характару і ступенькаў, якія займае той ці іншы начальнік на службовай драбіне. Ці не спадчына ўсё гэта ад былога СССР, па якім так ные душа не толькі ў прасталюдзіна? І ці не прыйшло гэта да нас з Азіі, ад іншай бытавой культуры?

Бывае так, што натхняльнікі і прыхільнікі старой камуністычнай сістэмы не грэбуюць недазволенымі метадамі барацьбы. У гэтых абставінах знікае, быццам іх і няма на свеце, культура, выхаванасць, чалавечая годнасць, сумленне, нарэшце. А ўсё для чаго? Дзеля канчатковай мэты — аднаўлення камуністычнага рэжыму, дзе правілі б, як некалі, "ум, честь и совесть" таталітарнай эпохі.

Вось два невялічкіх прыклады з гісторыі сучаснай барацьбы камуністаў за "шчаслівае" мінулае ў Расіі і на Беларусі.

Камуністычныя лідэры Расіі, ці заўважылі вы, стараючца з усіх сіл нагнятаць у народзе незадаволенасць існуючым рэжымам. То яны паднімуць вэрхал у Думе, то створаць абструкцыю прэмьер-міністрам, не даючы магчымасці стварыць нармальны ўрад. То прыдумаюць камісіі па імпічменце прэзідэнту, то для іх найпершай мэтай з'яўляецца зняць з пасады тэлекаментатараў, то трэба, каб былі ўведзены наглядальныя саветы ў СМІ замест колішняй цэнзуры. Праблемы, якія звязаны з эканамічным і фінансавым крызісам у Расіі, камуністаў не хвалююць. Іх хвалюе адно: даць магчымасць як мага болей разрасціся тым праблемам, якія могуць падняць народныя масы да крытычнай адзнакі незадаволенасці сваім прэзідэнтам, урадам. Вось у такія моманты камуністы — майстры браць уладу ў свае рукі. І нават, як яны самі не ўтойваюць, усімі магчымымі сродкамі. А мы ведаем, што ў іх ёсць адзіны сродак — пераварот. А для гэтага прыгодны ўсе акалічнасці. Захварэў прэзідэнт — прэзідэнта далоў! Ну з кім не бывае?! Ніхто з нас, у тым ліку і з камуністаў, не засцярожаны ад хваробы. І замест спачування, звычайнага, чалавечага, — бруд, хамства, здзек, зларадаснасць. Няўжо яны не ведаюць нармальных, дзяржаўных шляхоў вырашэння праблемы, калі, скажам, прэзідэнт па стане здароўя не можа кіраваць краінай? Няма ў камуністаў такога паняцця, як цывілізаваная форма барацьбы за ўладу. Як той казаў, усе іх стравы — з нейкім тухлым гарнірам, пераперчаныя, наспех зляпаныя, сырыя, з крывёю...

А вось нашы айчынныя камуністы (яны яшчэ чыкінцамі называюцца), пэўне, трошкі хітрэйшыя. Яны, наадварот, хваляць палітыку прэзідэнта, што загнала просты народ у тупік, давяла да галечы, усеагульнай скрухі. Яны стараюцца паддобрыцца да прэзідэнта, глядзяць яму ў рот, стаяць перад ім на дыбачках і аж вылузваюцца, каб выканаць усе ягоныя распараджэнні. Адным словам, прыліплі да ўлады, як да бабулі пудра. А вось калі нарэшце надыдзе той "рэвалюцыйны момант" і калі нават дурню будзе зразумела, што вярхі — не могуць, а нізы — не хочуць, вось тады яны выскачаць і стануць гукаць: "Назад, у СССР!". І тады яны пішчом палезуць на трыбуны, будуць цiснуцца, як прусакі ў шчыліну, да працоўных калон, арганізаваных прафсаюзамі і апазіцыяй, палезуць з чырвонымі сцягамі на барыкады і, як звычайна, будуць падбухторваць народ сваімі лозунгамі, накшталт: "Толькі камуністы здольныя вывесці з эканамічнага крызісу!", "Толькі камуністы накормяць народ!", "Толькі пад кіраўніцтвам камуністаў мы здолеем задушыць карупцыю і беззаконнасць у Беларусі!"... І што вы думаеце?! Шмат хто клюне на гэтага "жыўца", праглыне яго нават з "лескай". Было ж такое нядаўна, ці памятаеце?

Няўжо можна яшчэ раз падмануць народ? Нас жа столькі разоў праводзілі на мякіне. Няўжо зноў нам камуністы замест зярнят смецця падсыплюць? Хто ведае...

Нешта неспакойна на душы: царква гарыць, а людзі рукі грэюць...

в.Мазалі Маладзечанскага раёна.

Скажи, Мария...

Первый день третьего тысячелетия — 1 января 2001 года

На нашем заводе разгорелся спор, когда же начнется третье тысячелетие. Кто-то говорит, что 1 января 2000 года, кто-то — что 1 января 2001 года. Очень хотелось бы услышать ответ грамотного, авторитетного человека.

Геннадий Миронович, г.Жабинка, Брестская обл.

Думаю ваш спор наконец-то разрешится, потому как ответить на ваш вопрос я попросила директора Центра исследований будущего, профессора, доктора физико-математических наук Александра Сергеевича Потупу:

"Нулевого года не существует, ведь наша эра началась с первого года. Посему каждый век заканчивается числом с двумя нулями, а каждое тысячелетие — числом с тремя нулями, т.е. отсчет идет не от нуля, а от первого года. 20 век закончится 31 декабря 2000 года, и следовательно 1 января 2001 года станет первым днем третьего тысячелетия".

Выплата марок узникам нацизма продолжается

Когда будет произведена окончательная выплата марок по линии фонда "Взаимопонимание и примирение" бывшим узникам концлагерей и других мест принудительного содержания, а также несовершеннолетним. В печати прошла информация, что выплата будет произведена до конца 1998 года. Так ли это?

Надежда Афанасьева, г.Новополоцк.

В правлении Белорусского республиканского фонда "Взаимопонимание и примирение" мне пояснили, что окончательная выплата марок узникам концлагерей и других мест принудительного содержания еще не закончена. В 1999 году Фонд будет продолжать работу по оказанию финансовой помощи бывшим узникам нацизма, которые по каким-то причинам не смогли получить ее до сих пор.

Помимо того, фонд осуществляет доплаты бывшим узникам, представившим дополнительные документы по срокам и режиму содержания. Что касается третьего этапа выплат, то он, как пояснили в правлении фонда, не предусмотрен.

Методическая литература для всех педагогов

В прошлом году был принят документ, согласно которому деньги на приобретение методической литературы получили и воспитатели детских садов. Я работаю на полставки. Должна ли я получать дополнительные деньги?

Галина, г.Слуцк.

Сперва согласно постановлению Совета Министров "Об обеспечении педагогических работников методической литературой, предметными журналами и другими периодическими изданиями" дополнение к своей скромной зарплате получили только учителя школ. Им выплачивалась сумма в размере одной минимальной зарплаты для приобретения методической литературы.

В прошлом году исходя из президентского указа "О мерах по социальной поддержке работников учреждений образования, содержащихся за счет средств бюджета" и согласно приказу Министерства образования список педработников был расширен. Теперь и воспитатели детских садов один раз в году будут получать дополнительные денежки на приобретение методической литературы. И, как пояснили в Министерстве образования, получить денежки могут те педагогические работники, которые имеют "нагрузку не менее 0,5 ставки по основному месту работы".

Что значит лечение по методу Фолля?

Слышала об обследовании и лечении по методу Фолля. Не могла бы ты, Мария, рассказать поподробнее об этом методе в своем разделе и сообщить, где в Минске лечат по методу Фолля.

Сопруненко, Минск.

Кабинет обследования и лечения по методу Фолля открыт в 31 городской поликлинике Минска, на улице Бурдейного, 4.

Врачи кабинета с удовольствием рассказали мне об этом методе.

"Преимущество данного метода перед другими в том, что на электронном аппарате с помощью немецких биологических тестов за относительно короткий период времени и с точностью на 90 процентов можно установить причину возникновения заболевания.

Данным методом можно лечить практически все заболевания, которые не требуют экстренного хирургического вмешательства. Чаще всего пациентами кабинета являются дети с частыми простудными и аллергическими заболеваниями, кожными болезнями, болезнями желудочно-кишечного тракта. Есть опыт лечения женского бесплодия, заболеваний нервной системы, хорошие результаты при лечении гинекологических заболеваний."

Если вы хотите проконсультироваться или узнать какую-то дополнительную информацию о методе Фолля, звоните в поликлинику. Телефон: 8-017 (258-88-14).

Раздел ведет Мария НАРЕЙКО.

Тревожно!

Не хочу, чтобы у меня отобрали Родину — Беларусь

Мне за 60, я из поколения детей войны. Пережил все страдания и ужасы той страшной поры.

